Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Рэктар універсітэта
_____ Н.У.Карчэўская
21.06. 2024 г.
Рэгістрацыйны № УД 6-118 /эвуч.

АСНОВЫ ДЫКТАРСКАГА МАЙСТЭРСТВА

Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі
па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці
6-05-0215-04 Рэжысура прадстаўленняў і свят

2024

Вучэбная праграма складзена на падставе адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі па спецыяльнасці 6-05-0215-04 Рэжысура прадстаўленняў і свят, рэг. № 270 ад 21.08.2023.
планаў па спецыяльнасці 6-05-0215-04 Рэжысура прадстаўленняў і свят

СКЛАДАЛЬНІК:

У. А. Трапянок, дацэнт кафедры рэжысуры ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат мастацтвазнаўства

РЭЦЭНЗЕНТЫ:

У. А. Мішчанчук, дэкан тэатральнага факультэта ўстановы адукацыі «Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў», заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь, прафесар;

А. М. Акулёнак, дацэнт кафедры тэатральнай творчасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».

РЕКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:

кафедрай рэжысуры ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 6 ад 12.01.2024)

прэзідыумам навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 5 ад 19.06.2024)

ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная дысцыпліна «Асновы дыктарскага майстэрства» уключана ў Модуль «Моўнае дзеянне ў свяце» Большасць сучасных святочных мерапрыемстваў і праграм, разлічаных на аўдыторыю розных узроставых катэгорый, утрымлівае аўдыяльны кантэнт, які транслюецца вядучым / вядучымі пераважна «ўжывую», уплывае на развіццё дзеяння, данясення сэнсавай нагрузкі прыменанага тэксту і эмацыянальнага пасылу, у выніку чаго складваецца агульнае ўражанне ад прапанаванага сцэнічнага дзейства. Некаторыя аўдыяльныя фрагменты падобнага роду мерапрыемстваў і дзействаў гучаць у запісе, што вымагае яшчэ большай канцэнтрацыі на тэксце і яго падачы, паколькі мікрафон выкрывае ўсе хібы маўлення, падкрэслівае праўду ці фальш выканаўцы, яго разуменне прамоўленага ці бяздумную дэкламацыю.

Падрыхтоўка спецыялістаў, здольных удумліва, праўдзіва і бездакорна данесці тэкст – вось скіраванасць і практычная значнасць вучэбнай дысцыпліны «Асновы дыктарскага майстэрства». Яна прадугледжвае міждысцыплінарны падыход у спасціжэнні прафесіі, якая, здавалася б, ужо адышла ў мінулае, паколькі скончылася «эпоха дыктараў». Аднак сучаснае разуменне працы дыктара палягае ў шырокіх магчымасцях агучвання разнастайных тэкстаў, незалежна ад умоў ці месца гучання – на радыё і тэлебачанні, у гандлёвым цэнтры, на вакзале, у метро, закадравым голасе кіно, у відэаблогу, камп'ютарнай гульні, у рэкламе, call-цэнтры, ва ўніверсітэцкай аўдыторыі, на сцэнічнай пляцоўцы, адкрытым паветры і г. д.

Такім чынам, сёння дыктарам прынята называць прафесіянала, які агучвае выбранае для шырокай аўдыторыі. Дыктарская прафесія выйшла за межы аўдыявізуальных сродкаў масавай інфармацыі, з'яўляецца справай універсальнай, актуальнай і запатрабаванай, адпаведна, неабходнай для вывучэння ў творчых установах адукацыі.

Вучэбны прадмет «Асновы дыктарскага майстэрства» ўваходзіць у лік спецыяльных дысцыплін, накіраваных на падрыхтоўку высокакваліфікаваных рэжысёраў. Значнасць спасціжэння навыкаў дысцыпліны заключаецца ў разуменні тэарэтычнай базы і практычным прымяненні на сцэнічнай пляцоўцы, у вучэбнай аўдыторыі, падчас працы перад мікрафонам і ў іншых умовах неабходных ведаў і ўменняў – валодання выразным голасам і шчырымі эмоцыямі, правільным выкарыстаннем арфаэпічных норм, разумення зместу і сэнсу тэкстаў, здольнасці прысвоіць тэкст і праўдзіва і ярка паўздзейнічаць на аўдыторыю. Дысцыпліна «Асновы дыктарскага майстэрства» дапамагае засвоіць законы прамоўніцкага

майстэрства, арганічнага самаадчування дыктара падчас працы з тэкстамі розных жанраў у шырокіх прапанаваных абставінах.

Працэс навучання па дысцыпліне прадугледжвае комплексны, міждысцыплінарны падыход у развіцці акцёрскіх і дыктарскіх здольнасцей, фізічных уласцівасцей кожнага студэнта, навыкаў рэдагавання існуючых тэкстаў, пашырэння кругагляду будучых спецыялістаў. Дысцыпліна заклікана ўзбагаціць творчую прыроду кожнага з будучых рэжысёраў і педагогаў.

Вучэбная праграма складаецца з лекцыйнага матэрыялу, практычных заняткаў працы з тэкстамі (інфармацыйнымі паведамленнямі, публіцыстыкай, дакументальна-мастацкімі тэкстамі, вершамі, прозай, сцэнарыямі свят, рэкламай, п'есай, сцэнарыямі кінафільмаў і мультфільмаў, кампазіцыямі і інш.), мікрафонам, а таксама з творчых спроб на сцэнічнай пляцоўцы і ў студыях гуказапісу.

Галоўнай *мэтай* вучэбнай дысцыпліны «Асновы дыктарскага майстэрства» з'яўляецца фарміраванне ў студэнтаў, будучых рэжысёраў, ведаў аб прафесіі сучаснага дыктара і замацаванне практычных навыкаў высакакласнага агучвання разнастайных тэкстаў.

Дасягненне гэтай мэты ажыццяўляецца падчас рэалізацыі наступных *задач*:

– развіццё галасавых і псіхафізічных асаблівасцей;

– пашырэнне галасавога дыяпазону;

– знаёмства са стылямі дыктарскага майстэрства;

– пашырэнне практычных навыкаў акцёрскага майстэрства і імправізацыі;

– знаёмства з жанрамі сродкаў масавай інфармацыі, структурай рэкламных ролікаў;

– засваенне практычных навыкаў у мона- і полівыкананні тэкстаў, шматперсанажнага прачытання;

– прымяненне слоўнага дзеяння ў кантакце з рэальнай ці ўяўнай слухацкай аўдыторыяй;

– засваенне практычных навыкаў працы з мікрафонам;

– фарміраванне ўласнага дыктарскага стылю.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнты павінны *ведаць*:

– арфаэпічныя нормы літаратурнай мовы;

– асноўныя характарыстыкі ўласнага голасу;

– планы і перспектывы ў прамове, важнасць паўз;

– стылі сучаснага дыктарскага агучвання;

– структуру інфармацыйных выпускаў у аўдыявізуальных СМІ;

– структуру рэкламных тэкстаў і правілы іх агучвання;

– спецыфіку прачытання мастацка-дакументальных твораў, паведамленняў розных жанраў, стыляў і форм;

– спецыфіку ўспрымання тэкстаў у аўдыторыі розных узростаў.

Студэнт павінен *умець*:

– весці пошук неабходнай інфармацыі па выбранай тэме і ўмела выкарыстоўваць яе падчас практычных дзеянняў;

– карыстацца сваім голасам, валодаць практыкай «галасавога масажу» і разагрэву;

– ужываць шырокі дыяпазон голасу;

– дадаваць музыкальнасці і непасрэднасці ў гучанні;

– рэдагаваць існуючыя тэксты для лепшага ўспрымання на слых;

– выразна, лагічна, пераканаўча агучваць тэксты, што маюцца, «прысвойваць» іх;

– агучваць вершы, прозу, шматролевыя тэксты, сцэнарыі з выкарыстаннем інтанацыйнай выразнасці;

– прафесійна агучваць рэкламу;

– зладжана працаваць у творчай камандзе;

– запісваць самапрэзентацыйныя ролікі;

– працаваць з мікрафонам і гукаўзмацняльнай апаратурай;

– ствараць дыктарскі эмацыянальны «ўзрыў», а не тэатральны (праз сілу гуку);

– ствараць кампазіцыі;

– вызначаць настрой аўдыторыі і трансфармаваць яго ў залежнасці ад задач мерапрыемства;

– эмацыянальна ўздзейнічаць на ўяўную аўдыторыю, прымушаць яе паверыць агучанаму слову.

Студэнт павінен *валодаць*:

– законамі логікі мовы;

– голасам і целам для правільнага гучання на пляцоўцы і ў студыі;

– практыкай голасаперайманння, імітацыі голасам;

– прафесійнымі якасцямі дыктара;

– разнастайнымі тэхнікамі агучвання тэкстаў;

– механізмамі маўленчага і псіхаэмацыянальнага ўздзеяння на слухацкую аўдыторыю;

– асаблівасцямі працы з мікрафонам.

Змест вучэбнай дысцыпліны накіраваны на фарміраванне наступных кампетэнцый:

базавай прафесійнай кампетэнцыі: выкарыстоўваць навыкі рэжысуры і выканальніцкага майстэрства акцёра, прымяняць разнастайныя сродкі мастацкай выразнасці ў працэсе стварэння розных відаў свята;

Спецыялізаванай кампетэнцыі: прымяняць метады карэктыроўкі маўленых асаблівасцей галасавых даных у прафесійнай дзейнасці.

Асноўнымі формамі вучэбнай работы з'яўляюцца лекцыйныя і практычныя заняткі, а таксама выкананне самастойнай работы па прапанаванай дысцыпліне. У працэсе засваення зместу гэтай вучэбнай дысцыпліны рэалізуюцца індывідуальная і калектыўная формы навучання. Пры падрыхтоўцы да практычных заняткаў набываюцца навыкі самастойнай працы ў атрыманні неабходных ведаў і практычных навыкаў. Асаблівая ўвага надаецца працы з голасам і целам, з тэкстамі розных жанраў і форм, з мікрафонам, іншымі сродкамі фіксацыі голасу.

Вучэбным планам на вывучэнні дысцыпліны «Асновы дыктарскага майстэрства» ўсяго прадугледжана 90 гадзін, у тым ліку 48 гадзін аўдыторных заняткаў. Прыкладнае размеркаванне аўдыторных гадзін па відах заняткаў: лекцыі – 6 гадзін, практычныя заняткі – 22 гадзіны, індывідуальныя заняткі – 20 гадзін.

Рэкамендаваная форма правядзення бягучай атэстацыі студэнтаў – творчае заданне.

Рэкамендаваная форма правядзення прамежкавай атэстацыі студэнтаў – экзамен.

Працаёмкасць вучэбнай дысцыпліны складае 3 заліковыя адзінкі.

ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

Тэма 1. Уводзіны. Змест і значэнне дысцыпліны «Асновы дыктарскага майстэрства». Публічныя выступленні

Мэта і задачы вучэбнай дысцыпліны «Асновы дыктарскага майстэрства». Месца дысцыпліны ў сістэме профільных прадметаў па спецыяльнасці будучых рэжысёраў. Аб'ём, задачы і структура дысцыпліны. Характарыстыка раздзелаў дысцыпліны. Практычная скіраванасць дысцыпліны.

Сутнасць працы ля мікрафона – размова са слухачом. Сучасныя манеры гучання і паводзін ля мікрафона. Нязменнасць прыроды слыхавога ўспрымання. Паняцці «дыктар», «дыктарскае майстэрства», «агучка», «публічнае выступленне», «праца з мікрафонам», «інтанацыйная выразнасць», «арфаэпічныя нормы» і інш. Адказнасць самастойнай працы студэнтаў падчас авалодвання дысцыплінай. Рэкамендаваная літаратура, аўдыя- і відэаматэрыялы па дысцыпліне. Яскравыя асобы-дыктары мінуўшчыны і сучаснасці.

Публічнае выступленне – паняцце, віды публічных выступленняў, мэты, патрабаванні. Структура публічнага выступлення і яе элементы. Прывабліванне аўдыторыі. Правілы пазбаўлення хвалявання, боязі мікрафона.

Тэма 2. Віды размоўных прафесій. Формы і праблемы працы з тэкстамі

Дыктары сродкаў масавай інфармацыі. Прафесійныя акцёры, акцёры агучвання кіно, анімацыі і аўдыякніг, майстры дубляжу. Вядучыя мерапрыемстваў і святочных праграм. Спецыялісты кол-цэнтраў, «галасавой пошты», аўдыягідаў, агучанай рэкламы, камп'ютарных гульняў, дзіцячых цацак і г.д.

Дыктар як універсальны спецыяліст па агучванні тэкстаў рознага зместу і складанасці. Праца «ўжывую», у запісе. Падрыхтоўка галасавога апарата да працы, знаёмства з тэкстам як абавязковая ўмова прафесійнага агучвання.

Комплекс уздзеяння на слухача падчас працы дыктара – фізічныя, эмацыянальныя, псіхалагічныя затраты. Валоданне нормамі арфаэпіі рускай і беларускай моў – правільнае вымаўленне гукаў, складаных гукавых спалучэнняў.

Замацаванне законаў логікі мовы – маўленчыя такты, дакладны аб'ект,

галоўныя паняцці, другаснае ў тэксце, вызначэнне паўз і лагічных націскаў, правілы роднага склону, новага паняцця, пералічэнняў, проціпастаўлення і г. д. Праблемы агучвання: моцны пачатак – слабы фінал, ігнараванне ці дакладнае прытрымліванне знакаў прыпынку, факусіроўка на асобных словах, а не на думцы, рэгіянальныя асаблівасці, інтанацыйнае «падвешванне» ў канцы сказа ці фразы і г. д.

Тэма 3. Сучасныя спосабы дыктарскага агучвання. Стылі дыктара

Рысы дыктара – упэўненасць, прафесіяналізм, выхаванасць, добры густ, валоданне тэкстам, голасам, целам, стрэсаўстойлівасць, працаздольнасць, вынослівасць. Найбольш запатрабаваныя спосабы агучвання – «класічны дыктар», «дакладчык», «рэальны чалавек».

«Класічны дыктар». Традыцыйны спосаб агучвання – прама, эфектна, безадносна. «Дакладчык» – спалучэнне класічнага дыктара і рэальнага чалавека: адчувальная пазіцыя прамоўцы, выкарыстанне займеннікаў «мы», «вы», «ваш», «наш» і г. д. «Рэальны чалавек»: задача – персаніфікаваць паведамленне, агучыць яго шчыра, аб свайго імя.

Дыктар парадыйны, стылізаваны, камедыйны, апавядальнік, «іміджавы» і г. д.

Тэма 4. Цела і голас дыктара. Падрыхтоўка цела і маўленчага апарата да працы

Характарыстыкі і ўласцівасці голасу (тэмбр, сіла, палётнасць, дыяпазон, вынослівасць, рэгістр і г. д.). Жаночыя і мужчынскія галасы. Фактурныя галасы дыктараў. Узроставы дыяпазон, падзел галасоў.

Недахопы і праблемы голасу – афанія, дысфанія, фонастэнія, псеўдафонастэнія; прысвіст, шапялявасць, картавасць, гнусавасць, тонкія і высокія галасы, пабочныя гукі з роту і г. д. Гігіена голасу.

Размінка цела перад працай – разаграем плечы, шыю, рукі, цела. Трэніроўка дыхання. Размінка твару, артыкуляцыя, гукавы масаж, рэзаніраванне. Рух цела пры гучанні, станоўчы эфект усмешкі. Каардынацыя мозга і цела падчас гучання. Канцэнтрацыя і ўвага дыктара.

Тэма 5. Праца з тэкстам. Стылістычныя асаблівасці тэкстаў для агучвання

Знаёмства з тэкстам. Разбор тэкстаў па гарызанталі і вертыкалі, пошук галоўнага, другаснага; вызначэнне звышзадачы, наяўнасць падтэкстаў. Праца

са знакамі прыпынку. Правілы логікі маўлення на практыцы. Закон «трохадзінства мовы» – што, як і каму (з якой мэтай). Слоўнае дзеянне – бачанні, фантазія, мысленне вобразамі (прыёмы збору, стварэння бачанняў; уяўленне, адносіны – разуменне сэнсу, кантакт з рэальнай ці ўяўнай аўдыторыяй, уздзеянне).

Агульныя паняцці драматургіі – задумка, тэма, ідэя, фабула, сюжэт, жанр, дзеянне, характар, канфлікт. Стылі тэксту – навуковы, афіцыйна-дзелавы, публіцыстычны, мастацкі, размоўны. Праца дыктара з тэкстамі розных стыляў.

Спецыфіка рэдагавання тэкстаў для агучвання – неперагружаныя канструкцыі як гарантыя лепшага разумення аўдыторыяй. Эмацыянальнасць і аўтарская падача, пражыванне, «прысваенне» чужых тэкстаў. Значэнне паняцця «кінастужка бачання».

Тэма 6. Асабістае прафесійнае гучанне. Праца дыктара з мікрафонам

Асноўныя правілы – не чытаць, а расказваць; мінімізацыя знешніх перашкод, адасабленне ад побытавых праблем, зняцце фізічнага і псіхалагічнага заціскаў, персаніфікаванне паведамлення праз выкарыстанне «кінастужкі бачання», уключэнне эмоцый. Зарад голасу энергіяй праз трэнінг. Музыкальнасць голасу.

Інтанацыйная выразнасць і яе кампаненты: мелодыка, тэмп, паўза, сіла голасу, вышыня, лагічны націск, рытм, тэмбр. Стварэнне рытмічнага малюнка ў прамове. Вызначэнне тэмпу ў залежнасці ад мэтавай аўдыторыі і складанасці інфармацыі. Ужыванне паўз, лагічнага націску.

Мелодыя гучання на тэлебачанні, радыё, падчас агучвання твораў мастацтва ці забавак.

Агульныя характарыстыкі працы з мікрафонам. Мікрафон як памочнік і сябар, а таксама «зброя» супраць непрафесіяналізму. Правілы паводзін у студыі. Тэхніка працы з мікрафонам, адлегласць ад вуснаў. Тры ўмоўныя спосабы гучання ў мікрафон у залежнасці ад сілы голасу і пасылу. Адзенне ў студыі гуказапісу. Жэстыкуляцыя і рухі целам як спосаб пошуку патрэбнай эмоцыі ў голасе і тэмпарытму.

Тэма 7. Жанры тэкстаў СМІ і спосабы іх агучвання

Жанр як тып твораў мастацтва, літаратуры і журналістыкі з рысамі, уласцівымі шырокай групе падобных твораў. Ускладненне, сціранне жанравых межаў у сучаснай медыяпрасторы.

Інфармацыйныя жанры – паведамленне, нататка, карэспандэнцыя, інтэрв'ю, рэпартаж. Адасобленае дыктарскае агучванне, другасная роля дыктара, дасканалая падрыхтоўка да гучання без памылак і агаворак.

Знаёмства са структурай інфармацыйнага выпуску – «жорсткая» і «мяккая» формы навін. Складанне і агучванне ўласнага інфармацыйнага выпуску.

Аналітычныя жанры – каментарый, глоса, размова, ток-шоу, агляд лістоў ці паведамленняў, рэцэнзія, агляд і інш. Роля інтанацыі, паўз, тэмбру, тону, мелодыкі, размова «на роўных» з суразмоўцам, валоданне тэмай, прадметам гаворкі. Перадача ўнутранага стану, настрою і шчырасці. Запаволенасць тэмпу.

Дакументальна-мастацкія жанры – нарыс, фічар, кампазіцыя, радыёфільм, тэлефільм (закадравы голас), «плакат», пастановачныя перадачы (радыёкампазіцыі, шоу, радыёспектаклі) і інш. Выразныя сродкі дакументальна-мастацкіх жанраў, сярод якіх – «жывыя» галасы: «расказваем, а не чытаем». Спалучэнне публіцыстыкі, дакументалістыкі і ігравых сцэн у адным прадукце. Выкарыстанне навыкаў акцёрскага майстэрства, імправізацыі, інтанацыйнай выразнасці, веры ў прапанаваныя абставіны.

Тэма 8. Праца дыктара з рэкламнымі аб'явамі і тэкстамі рэкламнага характару. Самапрэзентацыя

Рэкламны прадукт як «герой» паведамлення. Элементы («спісы») рэкламы. Структура рэкламнага роліка. Спалучэнне кампанентаў інфармацыйных жанраў і рэкламы ў адным тэксце з адпаведнай галасавой падачай.

Правілы «ажыўлення» рэкламнага «героя» голасам, спецыфіка падачы тавараў ці паслуг канкурэнта. Чаргаванні рухаў твару на ўсмешцы і скідванне ўсмешкі пры агучванні рэкламы, праца з целам. Асаблівасці падачы элементаў рэкламнага роліка. Залежнасць пасылу голасу, блізкасці да мікрафона, адносін да прадукту і хуткасці падачы ад мэтавай аўдыторыі. Мелодыя гучання.

Персаніфікацыя паведамлення, матывацыя, эмоцыі пры агучванні. Запіс і выбар дубляў.

Самапрэзентацыя. Стуктура самапрэзентацыі – уступ, "кручок увагі", карта выступлення, асноўная частка, аргументацыя, завяршэнне, падвядзенне вынікаў. Прыёмы павышэння эфектыўнасці – канкрэтыка, магчымасць выбару, кароткасць, ужыванне займеннікаў "вы", "ваша" замест "я", маё", эмацыянальнасць, прастата, нагляднасць, крэатыўнасць, логіка.

Тэма 9. Праца дыктара з мастацкімі тэкстамі

Проза і паэзія як два асноўныя тыпы мастацкай мовы. Рытм як асноўнае адрозненне тыпаў. Эмацыянальнае ўздзеянне, а не рыторыка, дэкламацыя; не механічнае агучванне, а сааўтарства ў данясенні творчай задумкі. Значэнне фантазіі, уяўлення, ацэнкі фактаў, рух па лініі перспектывы да звышзадачы. Мелодыя гучання. Пошук не інтанацыі, а прычыны, якая нараджае інтанацыю.

Навыкі чытання вершаў з улікам памеру, метра твора, а таксама рыфмы. Дзве тактыкі агучвання вершаў – у залежнасці ад рытму ці сэнсу.

Разбор празаічнага твора, пошук характэрнага гучання для кожнага персанажа, у т. л. аўтара. Прысваенне і «ажыўленне» тэксту за кошт веры і праўдзівага існавання ў прапанаваных абставінах.

Тэма 10. Праца дыктара з аўдыядрамай, сцэнарыямі, пастановачныя чытанні

Шматперсанажнае гучанне (радыёспектаклі, казкі, сцэнарыі і г. д.): слухаем і рэагуем, інтанацыйная выразнасць і шырыня, гукавое непадабенства з партнёрам, імправізацыя, рухавасць голасу.

Чытка п'есы, разбор, стварэнне персанажаў. Праца ў камандзе з рэжысёрам, гукарэжысёрам, партнёрамі. Мабільнасць, рухавасць акцёрскага «нутра» і псіхафізікі падчас стварэння ролі. Стрыманасць галасавога пасылу перад мікрафонам. Уменне працаваць «з ліста».

Аўдыякнігі – выкарыстанне кантрасных галасоў і асабістых якасцей. Кожны персанаж жывы. Пазбяганне празмернай драматызацыі, цяжкіх карыкатур. Увага на працу з мікрафонам.

Агучванне дакументальных фільмаў, карпаратыўных прэзентацый – неафіцыйнае ці ўзважанае прачытанне, кампетэнтнасць і аўтарытэтнасць дыктара, паглыбленне ў сэнсавую нагрузку, правільныя акцэнты і разуменне тэксту. Інтанацыйная ўзвышанасць урачыстых ролікаў.

Агучванне мультфільмаў, казак – важнасць акцёрскага мастэрства і імправізацыі, рухавасць голасу, гукавая імітацыя і перайманне, шырыня дыяпазону, эмацыянальная выразнасць, поўнае паглыбленне ў матэрыял, дасканалая распрацоўка вобразаў. Утрымліванне вызначанага голасу для канкрэтнага персанажа, клопат аб яго характары. Ансамблевасць у шматролевым агучванні.

ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

Дзённая форма навучання

Нумар раздзела, тэмы	Назва раздзела, тэмы	Колькасць аўдыторных гадзін			Колькасць гадзін УСР	Форма кантролю ведаў
		Лекцыі	Практычныя заняткі	Індывідуальныя заняткі		
1.	Тэма 1. Уводзіны. Змест і значэнне дысцыпліны «Асновы дыктарскага майстэрства». Публічныя выступленні	2				
2.	Тэма 2. Віды размоўных прафесій. Формы і праблемы працы з тэкстамі	2				
3.	Тэма 3. Сучасныя спосабы дыктарскага агучвання. Стылі дыктара		2			
4.	Тэма 4. Цела і голас дыктара. Падрыхтоўка цела і маўленчага апарата да працы		2			
5.	Тэма 5. Праца з тэкстам. Стылістычныя асаблівасці тэкстаў для агучвання		2	2		
6.	Тэма 6. Асабістае прафесійнае гучанне. Праца дыктара з мікрафонам		2	2		
7.	Тэма 7. Жанры тэкстаў СМІ і спосабы іх агучвання		2	2		
8.	Тэма 8. Праца дыктара з рэкламнымі аб'явамі і тэкстамі рэкламнага характару. Самапрэзентацыя		2	2	2	праект
9.	Тэма 9. Праца дыктара з мастацкімі тэкстамі		4	4	4	праект
10.	Тэма 10. Праца дыктара з аўдыядрамай, сцэнарыямі, пастановачныя чытанні		2	4	4	праект
	Усяго	**4**	**18**	**16**	**10**	

ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЕ ЗАБЕСПЯЧЭННЕ

Літаратура

Асноўная

1. *Авяркова*, Н. К. Слоўнае дзеянне ў святе : вучэбна-метадычны дапаможнік / Н. К. Авяркова. – Мінск : БДУКМ, 2023. – 72 с.

2. *Каляда*, А. А. Гаворка беларуская. Разговор русский : дыкцыя і арфаэпія / Андрэй Каляда. – Мінск : Вышэйшая школа, 2020. – 214 с.

3. *Шагидевич*, А. А. Искусство сценической речи: учебное пособие для высших и средних специальных учебных заведений культуры и искусства / А. А. Шагидевич. – Минск : [б. и.], 1999. – 282 с.

Рэкамендаваныя метады навучання

Матэрыял выкладаецца на аснове сучасных метадычных патрабаванняў з улікам узроўню ведаў студэнтаў. Пры чытанні лекцый асаблівая ўвага надаецца разгляду тэарэтычных асноў пошуку і даследавання неабходнай інфармацыі па тэме дысцыпліны і яе перапрацоўцы, практычнага прымянення атрыманых ведаў у вучэбнай дзейнасці і ў розных напрамках сферы культуры і мастацтва.

Практычныя заняткі накіраваны на фарміраванне прафесійных уменняў і навыкаў, выкарыстанне атрыманых тэарэтычных ведаў пры выкананні канкрэтных заданняў па тэматыцы навучальнай дысцыпліны. Методыка правядзення ўказаных заняткаў павінна садзейнічаць развіццю творчых здольнасцей кожнага студэнта і набыццю навыкаў самастойнай работы. Варта прымяняць новыя формы арганізацыі працэсу навучання: візуалізаваныя лекцыі, выкарыстанне аўдыя- і відэаматэрыялаў, калектыўная практычная праца, дзейнасць у студыях гуказапісу і г. д.

Пералік рэкамендаваных сродкаў дыягностыкі

Для выяўлення і выключэння прагалаў у ведах студэнтаў рэкамендуецца выкарыстоўваць наступныя сродкі:

– франтальнае апытанне на лекцыях, практычных занятках;

– абарона выкананых на практычных занятках работ;

– выкананне творчых заданняў і іх афармленне, якія прадугледжваюць самастойны выбар метаду рашэння задачы;

– кансультацыі і субяседаванне.

Для вызначэння ступені адпаведнасці навучальных дасягненняў студэнта патрабаванням адукацыйнага стандарту таксама рэкамендуецца выкарыстоўваць праектную дзейнасць, якая ўключае праблемныя, творчыя задачы, што дапускаюць эўрыстычную дзейнасць і нефармалізаваны адказ.

Рэкамендацыі па арганізацыі самастойнай работы студэнтаў

Самастойная работа студэнтаў накіравана на ўзбагачэнне іх уменняў і навыкаў па вучэбнай дысцыпліне «Асновы дыктарскага майстэрства» ў вольны ад абавязковых вучэбных заняткаў час. Мэта самастойнай працы студэнтаў – садзейнічанне засваенню ў поўным аб'ёме зместу вучэбнай дысцыпліны праз сістэматызацыю, планаванне і кантроль уласнай дзейнасці, практычнае ўвасабленне атрыманых ведаў. Выкладчык дае заданні па самастойнай рабоце і рэгулярна правярае іх выкананне.